3. Национальный статистический комитет Республики Беларусь [Электронный ресурс.] – Режим доступа: https://www.belstat.gov.by/ofitsialnaya-statistika/publications/izdania/public_compilation/index_41896/. – Дата доступа : 27.09.2024.

# ВЯРХОЎНЫЯ БАГІ СЛАВЯНСКАГА ЯЗЫЧНІЦКАГА ПАНТЭОНА

**Зуеўская В. У.**

Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь
Навуковы кіраўнік – канд. філал. навук, дац. Хлусевіч І. М.

Репозиторий ГрГМУ

Тэма славянскага язычніцтва выклікае нязменнную цікавасць як у спецыялістаў, так і аматараў, паколькі пралівае святло на карані славянскай культуры. Язычніцтва, на змену якому прыйшло хрысціянства, характарызавалася антрапаморфным політэізмам, які з'яўляецца самай старажытнай формай уяўлення чалавека пра навакольны свет. У даўнія часы людзі не маглі растлумачыць многія з'явы прыроды, ад якой цалкам залежалі, таму адухаўлялі яе, уяўлялі ў выглядзе чалавекападобных багоў ці багінь, якія кіравалі гэтымі прыроднымі з'явамі і ўплывалі на лёс чалавека.

На жаль, звестак пра славянскі пантэон багоў захавалася не так многа. Так адбылося таму, што ў перыяд хрысціянізацыі ўсе помнікі паганства знішчаліся. Засталіся некаторыя запісы на гэту тэму выпадковых назіральнікаў, якія траплялі на тэрыторыю славян; пэўная інфармацыя пра славянскіх багоў змяшчаецца ў «Аповесці мінулых гадоў»; ёсць запісы хрысціянскіх прапаведнікаў, якія апісвалі паганскія звычаі славян, распавядаючы пра гэта ў негатыўным святле.

Рэканструяваць славянскі язычніцкі пантэон багоў можна на аснове міфалогіі ўсходніх славян, пра якую захавалася больш інфармацыі, чым пра заходнеславянскую. «Дадзеныя ж пра паўднёваславянскую міфалогію зусім бедныя: рана патрапіўшы ў сферу ўплыву старажытных цывілізацый Міжземнамор'я і раней за іншых славян прыняўшы хрысціянства, паўднёвыя славяне практычна цалкам страцілі звесткі пра былы склад свайго пантэона» [1, с. 5].

Славянскі язычніцкі пантэон не мае вялікай колькасці багоў, і той самы бог можа выступаць пад рознымі імёнамі. Ва ўяўленні старажытных славян, як і іншых этнічных супольнасцей, дабро супрацьпастаяла злу, таму і багі падзяляліся на светлых і цёмных. Галоўным светлым богам славяне лічылі Белабога: «Белабог – у славянскай міфалогіі бажаство, якое ўтварае дуалістычную пару (добрае – злое) з Чарнабогам. З'яўляецца ўвасабленнем святла. Прыносіць поспех, шчасце і выгоды мірскія» [2, с. 31]. «У Беларусі захаваўся абмежаваны ўспамін пра Белбога ў асобе Белуна. Гэта бажаство

прызнаецца беларусамі крыніцай багацця і літасці» [3, с. 68]. Уяўляюць Белуна «старым з доўгай белай (але не сівою) барадой, у белым саване, з белым носам» [3, с. 68].

Вельмі важнае месца ў славянскім язычніцкім пантэоне багоў займаў Сварог. У «Аповесці мінулых гадоў» ён паўстае ў выглядзе бога-каваля. У адным з фрагментаў летапісу гаварыцца аб тым, што менавіта Сварог паслаў людзям агонь у выглядзе маланкі, і з той пары полымя лічыцца сынам боскага Сварога [4, с. 132].

Яшчэ адным важным светлым богам славян-язычнікаў быў Дажбог – той, хто дае людзям усё найлепшае. На думку даследчыкаў, Дажбог у славян увасабляў сонца і лічыўся старэйшым сынам Сварога. Нашы продкі ўяўлялі Дажбога як прыгожага юнака з доўгімі сонечна-залатымі валасамі, сінімі вачамі, велічнай хадой і прамым позіркам, які распазнае любую хлусню [4, с. 134–135].

Як вышэй намі адзначалася, галоўным цёмным богам славяне-язычнікі лічылі Чарнабога, які ўвасабляе зло. «Вядома, што яго статуі былі чорнага колеру, са срэбнымі вусамі» [5, с. 48].

Да магутных цёмных сіл адносіцца і Марэна – «бажаство смерці чалавека і навакольнага свету – жывёл, раслін і інш.» [1, с. 342]. У навуковай літаратуры мы знайшлі такое апісанне гэтай багіні: «У народным уяўленні яна цёмная, кашчавая, з доўгімі рукамі, на доўгіх і тонкіх нагах» [6, с. 121].

У славянскім пантэоне ёсць даволі супярэчлівы бог – Вялес. З аднаго боку, ён заступнік жывёл, гаспадар лесу, а з іншага боку – ён бог падземнага царства. «Вялеса традыцыйна ўяўлялі як станістага валасатага і магутнага мужа, падобнага постаццю на мядзведзя» [4, с. 139].

Такім чынам, язычніцтва старажытных славян мела характар антрапаморфнага політэізму. У славянскім язычніцкім пантэоне багі падзялялія на светлых і цёмных. Вярхоўнаму светламу бажаству Белабогу процістаяў Чарнабог. Да галоўных светлых багоў славян-язычнікаў адносяцца Сварог і Дажбог, якія ўвасаблялі агонь і сонца, да цёмных – Марэна, кашчавая багіня смерці ўсяго жывога.

Вывучэнне веравання старажытных славян дазваляе дакрануцца да міфалагічнай свядомасці нашых продкаў і атрымаць больш поўнае ўяўленне пра культуру сучасных славян.

Літаратура:

1. Шапарова, Н. С. Краткая энциклопедия славянской мифологии / Н. С. Шапарова. – М. : АСТ, 2001. – 624 с.

2. Адамчик, В. В. Мифы Беларуси / В. В. Адамчик. – Минск : Харвест, 2014. – 319 с.

3. Фаминцын, А. С. Божества древних славян / А. С. Фамицин. – М. : Академический проект, 2012. – 315 с.

4. Барановская, И. Г. Мифы народов мира / И. Г. Барановская. – Минск : Адукацыя і выхаванне, 2002 – 160 с.

5. Семенова, М. В. Мы – славяне / М. В. Семенова. – М. : Азбука-Атикус, 2017. – 560 с.

6. Верклова, Ю. Д. Боги и архетипы древних славян / Ю. Д. Верклова. – М. : АСТ, 2023. – 352 с.



Репозиторий ГрГМУ